Пачаткі хрысціянства ў Рыме: дыскусіі і звесткі першакрыніц

Торканевский А. А. – г. Минск, исторический факультет БГУ, кандидат исторических наук, доцент кафедры истории древнего мира и средних веков.

Хрысціянская рэлігія бярэ свае вытокі ў іўдаізме – старажытнай рэлігіі яўрэйскага народа. У часы Рымскай імперыі іўдаізм быў дазволенай ўладамі рэлігіяй. Іўдзеі маглі бесперашкодна маліцца ў сінагогах, а яўрэйская дыяспара (яўрэйскія абшчыны па-за межамі Палесціны) даволі мірна суіснавала з суседзямі. Больш таго, іўдаізм прываблiваў грамадзян імперыі, якіх цікавіла монатэістычная рэлігійная сістэма (вера ў адзінага Бога). Калі такія людзі прымалі іўдзейскую веру, іх называлі празелітамі. Цэнтрам іўдаізма быў горад Іерусалім, які знаходзіўся ў Іўдзее. Тут была галоўная святыня іўдзеяў - Іерусалімскі храм. Гэты храм часоў імперыі быў ужо трэцім, бо два папярэднія – храм Саламона і храм Зарававеля – былі разбураны. Трэці храм пабудаваў у 9 годзе да н. э. цар Ірад Вялікі. Па багаццю і памерах ён пераўзыходзіў папярэднія: быў удвая вышэй за Саламонаў храм і пакрыты такой колькасцю золота, што пры яркім сонцы ззяяў асляпляльным святлом. Але ў 70 годзе н. э. пад час Іудзейскай вайны храм быў разрабаваны і разбураны рымлянамі.

У іўдаізме I ст. н. э. былі даволі яскрава выражаны месіянскія настроі. Іўдзеі чакалі збавіцеля (месію), які вызваліць народ ад захопнікаў-рымлян і стане новым царом. Прыход месіі прадказвалі яшчэ ветхазапаветныя прарокі. Месіянскія чаканні таго часу знайшлі сваё адлюстраванне ў дзейнасці шэрагу прарокаў-месій, найбольш вядомымі з якіх былі Іаан Хрысціцель, Феўда і яшчэ нейкі іўдзейскі прарок з Егіпту, імя якога не захавалася. Асаблівае месца, зразумела, займае Іісус Хрыстос з Назарэту. Менавіта ён лічыцца заснавальнікам адной з буйнейшых сусветных рэлігій – хрысціянства. Іісус, як і Іаан Хрысціцель, заклікаў людзей да духоўнага ачышчэння праз пакаянне. Іісус вучыў, што неабходна падрыхтавацца да страшэннага суду, які павінен быў наступіць у хуткім часе разам з канцом свету. Першапачаткова ў Іісуса была пэўная група прыхільнікаў, з якой затым ён вылучыў 12 найбольш блізкіх вучняў, якіх пасля

назвалі апосталамі (ад грэчаскага apostolos – пасланец, місіянер). Аднак большасць іўдзеяў не прызнала ў Іісусе чакаемага месію. Больш таго, кіраўн іцтва сінедрыёна (вышэйшы рэлігійны суд іўдзеяў) абвінаваціла яго ў ерасі і прымусіла рымскага намесніка Іўдзеі, Понція Пілата, пакараць Іісуса смерцю. Існуе шмат легенд пра зямное жыццё Іісуса, яго пакаранне і яго ўваскрэшанне.

Пасля смерці Іісуса Хрыста апосталы паступова пачынаюць распаўсюджваць вучэнне свайго настаўніка за межы Палесціны. Буйныя хрысціянскія абшчыны ўтвараюцца ў Антыохіі сірыйскай і ў грэчаскім Карынфе. Самым актыўным хрысціянскім апосталам-місіянерам быў Павел з кілікійскага горада Тарс, што ў Малой Азіі. Павел здзейсніў 4 буйныя місіянерскія падарожжы, пад час якіх заснаваў шэраг хрысціянскіх абшчын. Традыцыйна Павел лічыцца аўтарам 14 пасланняў да хрысціян розных абшчын, якія змешчаны ў свяшчэннай кнізе хрысціян – Новым Запавеце. Аднак у сучаснай гістарычнай навуцы аўтарства некаторых з гэтых пасланняў аспрэчваецца. Адным з аўтэнтычных (несумненна належачых апосталу) твораў Паўла лічыцца яго Пасланне да рымлян, якое было складзена каля 58 года. З тэксту паслання вынікае, што абшчына хрысціян ў сталіцы Рымскай імперыі існавала ўжо даволі працяглы час, і што Павел не з’яўляўся яе заснавальнікам. Цікава, што ў Пасланні змешчана прывітанне рымскім абшчыннікам, 24 з якіх пералічаны паімённа. Сярод іх названы Акіла, Прыскіла, Андронік, Юнія, Амплій, Урбан, Стахій і інш.

Што датычыцца часу заснавання хрысціянскай абшчыны ў Рыме, то варата мець на ўвазе, што яе патэнцыальныя заснавальнікі маглі сапраўды даволі рана прыняць хрысціянства. Справа ў тым, што іўдзейскае свята Пятидесятницы, з якім і звязана прыняцце імі хрысціянства, адбылося, паводле кнізе Дзеянні апосталаў, праз невялікі прамежак часу пасля смерці Іісуса. Тады апостал Пётр ахрэсціў каля 3000 асоб, у тым ліку і тых, хто прыйшоў на свята з Рыма (Дзеянні Апосталаў, II, 10). Акрамя таго, першыя звесткі аб хрысціянстве менавіта ў самім Рыме магчыма звязаць з антыіўдзейскімі акцыямі шмператара Клаўдзія. Паводле звестак рымскага гісторыка Гая Святонія Транквіла (каля 70 – 150 гг.), імператар Клаўдзій (41 – 54 гг.) загадаў выгнаць з Рима «іўдзеяў, пастаянна хвалюемых Хрэстом» (Жыццё дванаццаці цэзараў. Клаўдзій,

XXV, 4). У гэтых звестках шэраг даследчыкаў схільны бачыць пропаведзь хрысціянскага веравучэння, якая выклікала незадаволенасць і хваляванні ў іўдзейскім асяродку[1]. Звычайна выданне Клаудзіям адпаведнага указу адносяць да 49-52 гг[2].

Згодна са старажытным царкоўным паданнем, заснаваным на сведчаннях Ірынея Ліёнскага, Тэртуліана, Лактанцыя, Яўсевія Кесарыйскага, Іераніма Стрыдонскага і іншых хрысціянскіх аўтараў II – IV ст., заснавальнікам рымскай абшчыны быў апостал Пётр, які, да таго ж, кіраваў ёй 25 гадоў у якасці біскупа (ад грэчаскага episcopos – наглядальнік; вышэйшы духоўны сан ў праваслаўнай, каталіцкай, англіканскай і старажытнаўсходніх цэрквах) Аднак гэта, на думку некаторых даследчыкаў[3], малаверагодна, бо звесткі аб 25-гадовым епіскапстве Пятра ў Рыме супярэчаць больш надзейным звесткам кніг Новага Запавету. Паводле аўтара Дзеянняў апосталаў Павел правёў у Рыме два гады (верагодна 62-64 гг.), пад час якіх займаўся пропаведзю хрысціянства. Таксама старажытная хрысціянская традыцыя сцвярджае, што абодва першавярхоўныя апосталы Пётр і Павел былі катаваны ў 64 годзе ў Рыме ў сувязі з ганеннямі на хрысціян. Вядома, што ў гэтым годзе ў Рыме адбыўся пажар, у чым імператар Нерон абвінаваціў хрысціян, каб адвесці ад сябе падазрэнні ў падпеле. За гэта многія хрысціяне былі пакараны смерцю. Жудасныя сцэны пакаранняў апісвае рымскі гісторык Тацыт, адзначаючы, што хрысціян «аблачалі ў скуры дзікіх звяроў, каб яны былі паразрываны насмерць сабакамі, распіналі на крыжах, або… падпальвалі з наступленнем цемнаты дзеля начнога асвятлення» (Аналы, XV, 44). Магчыма, сярод іх былі апосталы Пётр і Павел. Так неронавымі карамі рымскіх хрысціян скончыўся першы этап гісторыі рымскай царквы, які ўмоўна можна назваць апостальскім.

Якім жа быў далейшы лёс хрысціянскай абшчыны Рыма ў 2 палове 60 – 90 гг.? Нажаль, аб гэтым з-за адсутнасці дастатковай колькасці крыніц нам вядома вельмі мала. Больш таго, фактычна, аб гэтым пасляапостальскім перыядзе гісторыі рымскай царквы нам вядома меньш, чым аб папярэднім. Неронавы кары з'явіліся цяжкім выпрабаваннем для рымскіх абшчыннікаў. Магчыма, абшчына была знішчана і адрадзілася не хутка, бо наступныя пасля пажара дакладныя сведчанні аб рымскіх хрысціянах адносяцца да 90 гг. і звязаны з прозвішчам рымскага святара Клімента.

Даследчыкам прыходзіцца толькі рабіць здагадкі аб тым, што адбывалася ў той час у асяродку рымскіх хрысціян. Французскі царкоўны гісторык Луі Дзюшен, напрыклад, мяркуе, што «евангелія Марка і Лукі, Дзеянні апосталаў, Першае пасланне Пятра, Пасланне да яўрэяў, склаліся у рымскай абшчыне раней або пазней ўзяцця Іерусаліма і што там жа былі сабраны ў адно пасланні апостала Паўла»[4].

Некаторыя навукоўцы зыходзяцца ў думцы, што пры пераемніках Нерона ажно да Даміцыяна нічога не парушала спакою рымскіх хрысціян[5]. Такое меркаванне заснавана, верагодна, на тым факце, што ні хрысціяне, ні язычніцкія аўтары нічога не паведамляюць аб якіх-небудзь дзеяннях улад супраць рымскай царквы, ці аб стане хрысціянскай абшчыны Рыма. У той жа час менавіта падзеі другой паловы 60-х гг. пэўным чынам звязалі лёс рымскай абшчыны са старэйшай абшчынай ў Іерусаліме.

У чым жа заключалася гэта сувязь? Відавочна, што пасля кары Іісуса іерусалімская хрысціянская абшчына стала духоўным цэнтрам новай рэлігіі: адтуль накіроўваліся апосталы прапаведваць Евангеліе, і менавіта туды кожны раз імкнуўся прыходзіць пасля сваіх падарожжаў апостал Павел. Крыху болей за 30 гадоў абшчына хрысціян святога горада ўтрымлівала за сабой права лічыцца цэнтрам хрысціянскага свету. І гэту манаполію яна згубіла з разбурэннем у 70 г. н. э. іерусалімскага іўдзейскага храма.

Вядома, што пасля пакаранняў хрысціян у Рыме ў 66 годзе ў Іўдзее пачалося антырымскае паўстанне (Святоній. Жыцце 12 цэзараў, Боскі Веспасіян, 4). Гэта паўстанне падрабязна апісана яго ўдзельнікам - яўрэйскім гісторыкам Іосіфам Флавіем (37 – кал. 100 гг. н. э.) у кнізе «Іўдзейская вайна». У 70 годзе рымляне на чале з палкаводцам Цітам Флавіям Веспасіянам, сынам імператара Веспасіяна, узялі асадай Іерусалім і спалілі іўдзейскі храм. Паўстанне было падаўлена. Апісанню гэтых падзей Іосіф поўнасцю адводзіць шостую кнігу сваёй «Іудзейскай вайны». Якія ж адносіны мае гэтае паўстанне да гісторыі хрысціянства і да гісторыі рымскай царквы. Французскі гісторык царквы Эрнэст Рэнан адзначае: «… для хрысціянства разбурэнне Іерусаліма і храма з'яўлялася самым вялікім шчасцем»[6].

Паглядзім, у чым тут справа. Ітак, што ж атрымала хрысціянства ў выніку разбурэння іерусалімскага храма? Вядома, што Іісус наведваў храм, да і жыццё іерусалімскіх хрысціян было цесна звязана з храмам. Але менавіта ў гэтым на думку Э.

Рэнана была найбольшая пагроза для хрысціянства: пагроза празмернага развіцця іўдзейскіх уплываў праз галоўную іўдзейскую святыню. Ён адзначае: «Не будзь разбураны храм, хрысціянства, несумненна, спынілася б у сваім развіцці. Храм заставаўся б цэнтрам усялякіх іўдзейскіх пачынанняў. Царква іерусалімская, засяроджаная вакол свяшчэнных двароў, працягвала б, у імя свайго першынства, быць прадметам пакланення ўсяго света, стала б пераследваць хрысціян царквы, заснаванай Паўлам, і патрабаваць абразання і прытрымлівання Маісеева закона для таго, каб мець права звацца паслядоўнікамі Іісуса… Замацаваўся б цэнтр непагрэшнай ўлады, узнік бы патрыярхат, штосьці наконт калегіі кардыналаў, на чале з такімі асобамі, як Іакаў, істых яўрэяў, членаў сям'і Іісуса. Такі патрыярхат быў бы вялізарнай пагрозай ўзнікаючай царкве»[7].

Ці было б усё менавіта так, як гэта ўяўляў сабе Рэнан? Магчыма ён і перабольшваў, аднак, несумненна, што пэўная небяспека значнага ўплыву элементаў іудаізму на іерусалімскую царкву ўсё ж была. А калі прыняць да ўвагі тое, што гэтая царква мела першынства, то такая небяспека для хрысціянства – застацца іудзейскай сектай – яшчэ больш узрастала. Маладой рэлігіі неабходна было выйсці за межы Іўдзеі, каб пазбегнуць празмернага ўплыву іудаізму, што і было паспяхова зроблена апосталамі-місіянерамі, у першую чаргу, намаганнямі апостала Паўла. Яшчэ да Іудзейскай вайны раслі і мацнелі абшчыны хрысціян з язычнікаў у Рыме, Анціёхіі, Эфесе. Не варта забываць, што хрысціянства як рэлігія фарміравалася пад уплывам не толькі іудаізму, але і грэка-рымскай культуры.

Якім жа быў лёс іерусалімскай царквы пасля разбурэння Іерусаліма ў 70 г.? Адказ дае гісторык царквы IV ст. н. э. Яўсевій Кесарыйскі. У трэцяй кнізе сваёй «Царкоўнай гісторыі» (далей Ц. Г.) ён паведамляе, што яшчэ напярэдадні паўстання, «павінуючыся адкравенню шаноўных мужоў» (Ц. Г., III, 5.), хрысціяне пакінулі Іерусалім і пасяліліся ў горадзе Пелла. Хрысціяне пакінулі не толькі Іерусалім, але і «усю Іўдзейскую зямлю» (Ц. Г., III, 5). Пры гэтым важную роль у новай царкве пачалі граць сваякі Іісуса: яе прадстаяцелем стаў, по паданню, стрыечны брат Збавіцеля – Сімяон (Ц. Г., III, 11).

Па-сутнасці, адзіная некалі, іерусалімская царква распалася на шэраг дробных абшчын, адрэзаных ад грэка-рымскага света, якія ўсё болей замыкаліся ў сабе за-за

выканання Маісеева закона. Пазней гэтыя іудзеа-хрысціянскія абшчыны атрымаюць назву «эбіянітаў» і «назарэяў»[8]. З-пад пяра прадстаўнікоў менавіта гэтых абшчын у II ст. н. э. (даціроўка спрэчная) выйдзе знакаміты цыкл апокрыфаў, вядомых пад агульнай назвай «Кліменцін» ці «Псеўдакліменцін» (іх аўтарства памылкова прыпісывалася Кліменту Рымскаму)[9]. Цікава, што першыя рэдакцыі гэтых твораў адрознівае крайняя варожасць да святога Паўла, «апостала языкоў», і праслаўленне святога Пятра - «апостала абразання». Узаемаадносіны гэтых апосталаў адлюстраваны ў «Кліменцінах» у форме супрацьстаяння. Верагодна каб не выклікаць падазронасці ў хрысціян з язычнікаў, апостал Павел схаваны аўтарам «Кліменцін» пад іменем Сымона-мага. Але ў больш позніх рэдакцыях гэтых апокрыфаў аўтар мірыць абодвух апосталаў. Па меркаванню некаторых даследчыкаў[10], гэта з'яўлялася сімвалам прымірэння дзвюх партый ў хрысціянстве: іудзеа-хрысціян і хрысціян з язычнікаў.

Здавалася б, ужо мінае небяспека для хрысціянства з боку прававерных іудзейскіх элементаў: храм разбураны, а сама іерусалімская царква пакінула святы горад, перабраўшыся ў правінцыю, і, верагодна, распалася на шэраг абшчын. Але, на думку Э. Рэнана, пэўная пагроза заставалася: «Сваякі Іісуса былі людзьмі набажнымі, ціхімі, мяккімі і сціплымі… але ў той жа час яны прадстаўлялі сабой надзвычайна прававерных яўрэяў і званне сыноў Ізраіля ставілі наперадзе усялякіх іншых пераваг. Прыблізна з 70 па 110 гады яны сапраўды кіруюць царквамі па той бок Іардана і ствараюць штосьці накшталт хрысціянскага сената... Нараджалася штосьці накшталт арыстакраціі хрысціянства… Устанаўленні, маючыя рэлігійную мэту, гінуць, як толькі ў іх пачынаюць пераважваць меркаванні сямейныя, каставыя ці спадчынныя… сапраўднымі спадчыннікамі вялікага чалавека з'яўляюцца тыя, хто працягвае яго справу, а не яго сваякі па крыві. Лічачы традыцыю Іісуса сваёй маемасцю, маленькі гурток так званых назарэяў, несумненна, заглушыў бы яе»[11]. Аднак гісторыя распарадзілася па-іншаму. Назарэі і эбіяніты зніклі ў забыцці (іх сляды губляюцца дзесьці ў IV - V ст.), у той час як абшчыны, адзначаныя дзейнасцю апостала Паўла, у першую чаргу рымская, становяцца цэнтрамі развіцця і распаўсюджаання хрысціянства.

«Па меры таго, як падае царква іерусалімская, узвышаецца царква ў Рыме, - піша Рэнан. - Або, лепей сказаць, у наступныя за перамогай Ціта гады становіцца відавочна,

што рымская царква ўсё больш і больш становіцца спадкаемніцай царквы іерусалімскай і замяняе яе… Без Ціта папа апынуўся б у Іерусаліме, але з той розніцай, што іерусалімскі папа задушыў бы хрысціянства праз нейкіх сто - дзвесці гадоў, тады як Папа Рымскі ператварыў яго ў рэлігію ўсяго света»[12]. Тут з Рэнанам згодны многія гісторыкі[13]. Напрыклад, Функ піша: «Пасля таго, як у 70 годзе закацілася зорка іерусалімскай царквы, ярка гарэўшая на ўсім хрысціянскім небасхіле, рымская абшчына зрабілася першай»[14]. «Хрысціянства страчвала сваё першаснае засяроджанне, - заўважае Дзюшэн, - як раз у той момант, калі рымская царква дастаткова саспела для таго, каб заступіць на яе месца. Сталіца імперыі хутка стала метраполіяй для ўсіх хрысціян»[15].

Такім чынам, падзенне Іерусаліма – вельмі важны, калі не галоўны фактар, які садзейнічаў узвышэнню рымскай хрысціянскай абшчыны.

Што яшчэ садзейнічала станаўленню абшчыны Рыма ў авангардзе хрысціянскага света? Сярод найбольш важкіх перадумоў можна вылучыць наступныя.

Па-першае, вельмі многа значыла тое, што гэтая абшчына знаходілася ў сталіцы Рымскай імперыі, што павялічвала яе значэнне. Але тут трэба мець на ўвазе, што першапачаткова, калі хрысціяне чакалі хуткага Другога Прышэсця Ісуса Хрыста, яны наўрад ці звязвалі свой лёс з Рымскай імперыяй, а сталічнае становішча Рыма, як цэнтра імперыі, не магло мець у іх вачах асаблівага значэння. Аднак па меры ўсё большага распаўсюджвання хрысціянства і згасання эсхаталагічных настрояў, значэнне сталічнага стану рымскай царквы, несумненна, паступова ўзрастала.

Па-другое, рымская абшчына была асвечана крывёю мноства хрысціянскіх пакутнікаў (кары пры Нероне ў 64 і, магчыма, у 90-х гг. пры Даміцыяне), сярод якіх, па паданню, былі найвялікшыя апосталы, стаўпы царквы Петр і Павел. Гэта яшчэ больш павялічвала яе аўтарытэт, якая ўжо пры жыцці апосталаў была ў вялікай пашане сярод хрысціян. Нагадаем, што апостал Павел, які часта папракаў у сваіх пасланнях неспакойных карынфян і галатаў, аб рымскай хрысціянскай абшчыне пісаў у сваім Пасланні да рымлянаў наступнае: «…дзякую Бога майго праз Ісуса Хрыста за ўсіх вас, што вера ваша абвяшчаецца ва ўсім свеце…» (Рым. 1, 8). Тэндэнцыя праслаўляць рымскую царкву захавалася і ў II ст. Анціяхійскі біскуп Ігнацій Баганосец называе гэту царкву «богадастойнай, дастаслаўнай, дастаблажэннай, … чыстай і першынствуючай ў

любві…»[16]. Безумоўна, узвышэнне рымскай абшчыны – працэс не адного дня, года і нават дзясяцігоддзя. Але да часу падзення іерусалімскага храма пэўныя перадумовы, названыя вышэй, верагодна, ужо склаліся.

І ўсё ж, хоць мала мы ведаем аб раннім перыядзе рымскай царквы, у гісторыі яе першага стагоддзя ёсць, па меньшай меры, дзьве даты, якія прымаюцца большасцю даследчыкаў за даставерныя. Адна з іх – гэта 64 год, калі рымскую абшчыну спасціглі пакаранні з абвінавачваннямі яе членаў у сувязі р падпалам горада. Наколькі сур'ёзнымі яны былі дакладна не вядома, паколькі да нашага часу дайшлі толькі ўрыўкавыя сведчанні сучаснікаў, да і тыя ў язычніцкіх аўтараў[17]. Апакаліпсіс Іаана Багаслова, які напісаны, відавочна, не без уплыву гэтых падзей, не дае ўяўлення аб стане рымскай абшчыны. Іншыя хрысціянскія аўтары І-ІІ ст. таксама маўчаць аб гэтым. Нагадаем, што і «Дзеянні апосталаў» евангеліста Лукі абрываюцца якраз на падзеях у Рыме за 1-2 гады да пажара. Цікавым чынам гэта тлумачыць Э. Рэнан: «Аўтар Дзеяній пазбягае ўсяго, што можа паказаць рымлян, як ворагаў хрысціянства… Ён спыняе сваё апавяданне на прыбыцці Паўла ў Рым, магчыма, дзеля таго, каб не быць вымушаным апісваць жахі Нерона. Лука не прызнае, каб хрысціянства было б некалі законна скампраметавана» [18].

95-97 гг. – другая дата, калі рымская царква заяўляе аб сабе. Менавіта гэтым перыядам звычайна датуюць першае Пасланне Клімента Рымскага да карынфскай царквы.

Увогуле, тое нешматлікае, што нам вядома аб рымскай царкве разглядаемага перыяда, датычыцца, у першую чаргу, яе прадстаяцеляў. Так Ірыней Ліёнскі, хрысціянскі пісьменнік ІІ ст. і Яўсевій, які пісаў у першай чвэрці IV ст. пералічваюць рымскіх біскупаў таго часу. Строга кажучы, мы не можам называць іх біскупамі, паколькі ў гістарычнай навуцы існуе тэорыя, згодна якой ў І ст. царкоўнае кіраванне ажыццяўлялася не біскупам, а групай прэсвітэраў[19]. А так званы манархічны біскупат, на думку прыхільнікаў гэтай тэорыі, сфарміраваўся не раней за першую чвэрць ІІ ст. На якой жа тады падставе ў спісы рымскіх біскупаў, складзеныя Ірынеем і Яўвсевіям, з калегіі прэсвітэраў трапляў толькі адзін чалавек? Пытанне няпростае. Крыніцы, нажаль, не даюць на яго адказ. Таму дазволім сабе выказаць меркаванне, што асобы, якія трапілі ва ўказаныя спісы, магчыма, чымсьці вылучаліся з калегіі прэсвітэраў, або іграліў ёй

вядучую ролю. Іншымі словамі, у спісы трапілі прэсвітэры, «якія пакінулі пасля сябе якое-небудзь імя»[20], г. зн. запомніліся, вызначыліся сваімі справамі. Зразумела, што цяжка канчаткова задаволіцца такім адказам, але, ва ўмовах адсутнасці сведчанняў крыніц, нам прыходзіцца абмяжоўвацца гіпотэзай.

Узнікае яшчэ пытанне, чаму Ірыней і Яўсевій называюць пераемнікаў апостала Пятра «біскупамі», а не «прэсвітэрамі». Верагодна, мае месца перанос сучаснай аўтарам назвы на больш ранні час. Іншы варыянт рашэння гэтага пытання можа быць наступным. Магчыма Ірыней и Яўсевій называюць сапраўдных біскупаў Рыма, валодаўшых пры гэтым сваімі першапачатковымі функцыямі (казначэйскімі), а не функцыямі кіравання царквою. Г. зн., што ў дадзеным выпадку пад гэтымі біскупамі трэба разумець менавіта казначэяў, а не кіраўнікоў царквы (што стала іх прэрэгатывай толькі пазней). Увогуле, на думку некаторых навукоўцаў рымскія біскупы I ст. яшчэ былі далёкімі ад адзінаасобнага кіравання царквою і займаліся пераважна гаспадарчымі справамі абшчыны[21].

Аднак, варта звярнуцца непасрэдна да саміх крыніц і паглядзець, каго з першых рымскіх «біскупаў» яны называюць. У трэцяй кнізе «Супраць ерасяў» Ірыней зазначае: «Блажэнныя апосталы, заснаваўшы і ўпарадкаваўшы царкву, уручылі біскупскае служэнне Ліну; аб гэтым Ліне апостал Павел узгадвае ў Пасланнях да Цімафея» (III, 3, 3). Гэта ўсё, што ёсць у Ірынея пра гэтага біскупа. Словы Ірынея аб Ліне цытуе і Яўсевій Кесарыйскі ў «Царкоўнай гісторыі» (V, 5, 9; V, 6, 1). Апрача гэтага, Яўсевій яшчэ некалькі разоў адзначае, што Лін быў першым (пасля апостала Пятра) біскупам рымскай царквы (Ц. Г., III, 2, 1; III, 4, 8; III, 13, 1; III, 21, 1). Услед за Ірынеем Яўсевій таксама атаясамлівае гэтага Ліна з тым, аб якім піша апостал Павел у Другім пасланні да Цімафея (Ц. Г., III, 4, 8; III, 2, 1). Некаторыя даследчыкі схільны прыняць такое атаясамленне[22].

Сапраўды, ёсць шэраг падстаў пагадзіцца.

Па-першае, Павел пісаў гэтае пасланне з Рыма, а з паслання выходзіць, што Лін знаходіўся ў той час з Паўлам. Адсюль, няма сумненняу, што Лін сапраўды быў у Рыме.

Па-другое, імя Ліна апостал узгадвае, калі перадае прывітанне сваяму вучню Цімафею ад усіх рымскіх хрысціян. Прычым імя Ліна выдзелена ад словазлучэння «усе брацыя», ад якіх ідзе прывітанне Цімафею. Праўда, выдзелена не толькі імя Ліна, а яшчэ з дзьвюма «браціямі» (Еввул і Пуд) і нейкай Клаўдзіяй. Калі апостал вылучае з усёй

абшчыны гэтых чатырох асоб, называючы іх па імёнах, то яны, верагодна, гралі асаблівую ролю ў абшчыне[23]. Можна лічыць, што гэтыя асобы (акрамя жанчыны) якраз і маглі складаць калегію прэсвітэраў.

Здавалася б Яўсевій поўнасцю толькі паўтарае сведчанні Ірынея. Але на самой справе дадзеныя «айца царкоўной гісторыі» часткова дапаўняюць інфармацыю Ірынея аб Ліне, а часткова і супярэчаць ей. Так, напрыклад, Яўсевій, упамінаючы Ліна першы раз у сваей працы, паведамляе: «Пасля пакутніцкай смерці Паўла і Пятра першым біскупам рымскай царквы быў па жрэбію прызначаны Лін» (Ц. Г., III, 2, 1). Тут Яўсевій супярэчыць Ірынею, у якога Лін прызначаецца самімі апосталамі. Якой крыніцы давяраць больш? І хаця абодва варыянта прызначэння Ліна ўяўляюцца верагоднымі, перавагу, магчыма, варта аддаць Ірынею, як больш ранняму сведку.

Далей Яўсевій апісвае яшчэ адзін цікавы факт: «Пасля дзесяці год кіравання Веспасіяна яму наследваў яго сын Ціт. На другім годзе яго царствання Лін, біскуп рымскай царквы, які дванаццаць год служыў ёй, перадаў яе Анаклету» (Ц. Г., III, 13, 1). Вядома, што Ціт кіраваў Рымскай імперыяй 2 гады (79 - 81 гг.). Вынікае, што Лін пачаў служыць рымскай абшчыне за 12 год да гэтага, г. зн. у 69 годзе. Калі верыць Яўсевію, Лін быў рымскім біскупам у 69 - 81 гг. Аднак сучасныя даследчыкі прыводзяць некалькі іншыя даціроўкі (67 – 76/79 гг.)[24]. У. Задворны, спасылаючыся на даволі познюю крыніцу Liber Pontiticalis (VI - VII ст.), піша, што Лін быў родам з Таскані, прыняў пакутніцкі вянец і быў пахаваны каля святога Пятра[25]. Але ранейшыя крыніцы аб гэтым нічога не кажуць. Верагодна, прыйдзецца пагадзіцца з тым, што даставерных сведчанняў аб гэтым біскупе ці прэсвітэры пакуль ў нас няма.

З вышэйпрыведзенага ўрыўка Яўсевія вынікае, што пераемнікам Ліна быў нейкі Анаклет, які стаў біскупам на другі год праўлення Траяна, г. зн. у 81 г. Аб Анаклеце звестак яшчэ менш, чым аб Ліне. Ірыней Ліёнскі таксама называе Анаклета пераемнікам Ліна (Супраць ерасяў, III, 3, 3). У Яўсевія гэта імя сустракаецца тройчы (прычым адзін раз ён цытуе Ірынея). Пры гэтым аўтар нічога не паведамляе аб Анаклеце, акрамя таго, што той быў біскупам пасля Ліна (Ц. Г., III, 13, 1; III, 21, 1; V, 6, 2). Але аб тым, колькі часу Анаклет быў біскупам, Яўсевій не піша. Відавочна, што ў дадзеным выпадку звесткі Яўсевія не дапаўняюць звесткі Ірынея. Сучасныя вучоныя даюць наступную даціроўку

гэтай падзеі - 76-88 гг.[26] і 79-90 гг.[27]. Аб Ліне і Анаклеце пішуць таксама хрысціянскія аўтары канца IV – пачатку V ст. – Епіфаній Кіпрскі (307 – 403 гг.) і Іеранім Стрыдонскі (каля 347 – 420 гг.). Гэтыя крыніцы некалькі больш позднія, чым разгледзеныя вышэй, але не меньш каштоўныя. Таму звернемся і да іх.

Так Іеранім у сваей працы «Аб знакамітых мужах» адзначае, праўда, не без сумненняў, што Лін і Анаклет былі другім і трэцім біскупамі пасля Пятра (Аб знакамітых мужах, 15). Тут аўтар строга трымаецца звестак Ірынея і Яўсевія. Епіфаній Кіпрскі прыводзіць некалькі іншыя звесткі. Другога рымскага біскупа ён называе не Анаклетам, а Клітам (Епіфаній. Панарыён, XXVII, 6). Зараз ужо ўстаноўлена, што гэта адна і тая ж асоба[28]. А Э. Рэнан заўважае, што Анаклета сталі называць Клітам даволі рана і, як следства, лічылі іх за розных асоб[29]. Гэтая блытаніна абумоўлена, верагодна, тым, што і ў старажытнасці аб другім біскупе Рыма ведалі няшмат. Адзначым, што Анаклета (Кліта), у адрозненні ад Ліна не атаясамлівалі з новазапаветнымі персанажамі. Трэцяга біскупа Рыма, святога Клімента Рымскага, хрысціянская традыцыя атаясамлівала з нейкім Кліментам, аб якім пісаў апостал Павел у Пасланні да філіпійцаў.

Адно з найбольш ранніх сведчанняў аб Кліменце належыць Ірынею Ліёнскаму. Ён піша, што «на трэцім месцы ад апосталаў атрымлівае біскупства Клімент, які бачыў блажэнных апосталаў» (Супраць ерасяў, III, 3). Нажаль, мы не можам дакладна сцвярджаць, што Клімент ведаў апосталаў. Магчыма, што так, але магчыма і іншае. Ірыней мог зрабіць выснову, што Клімент быў знаёмы з апосталамі, на падставе атаясамлівання гэтага Клімента з тым, аб якім, як ужо казалася, пісаў апостал Павел. І падставы так лічыць у Ірынея, магчыма, таксама былі. Звяртаючыся да нейкага Ея, апостал Павел ў Пасланні да філіппійцаў піша: «… прашу і цябе, шчыры супрацоўнік, дапамогай ім, падвізаўшымся ў благавестванні разам са мною і з Кліментам і з іншымі супрацоунікамі маімі, якіх імёны – у кнізе жыцця» (Філіп., IV, 3). Магчыма, што выдзяленне Клімента з «іншых супрацоунікаў» Паўла ў дадзеным выпадку дазволіла Ірынею заключыць, што гэты Клімент быў нейкай важнай асобай, магчыма і біскупам. Верагодна, што Ей ведаў з усіх сяброў Паўла толькі Клімента, таму Павел і называе толькі яго па імені. Што дакладна меў на ўвазе Павел, выдзяляючы Клімента, мы сказаць не можам, адсюль і рабіць вывады вельмі цяжка.

У цэлым, аб Кліменце Рымскім вядома вельмі мала. Але галоўнае, трэба мець на ўвазе тую мэту, якую ставіў Ірыней ў сваім творы «Супраць ерасяў» - аправергнуць ерэтычныя вучэнні. А дзеля гэтага яму неабходна было паказаць чысціню хрысціянскага царкоўнага вучэння праз апостальскую пераемнасць біскупскага служэння. Таму ён і піша аб тым, што трэці біскуп Рыма, Клімент, асабіста ведаў апосталаў. Невыпадкова шэраг даследчыкаў падвяргае сумненню атаясамленне Клімента Рымскага з супрацоўнікам апостала Паўла. Э. Рэнан, напрыклад, піша: «Клімент, па ўсей верагоднасці, не застаў ужо ні Пятра, ні Паўла»[30].

Як бы там ні было, па звестках Ірынея атрымліваецца, што Клімент Рымскі быў трэцім біскупам «вечнага горада» і ведаў апосталаў. Гэты пункт гледжання Ірынея падзяляюць хрысціянскія аўтары больш поздняга часу – Яўсевій Кесарыйскі і Іеранім Стрыдонскі.

Яўсевій называе Клімента «сабратам і спадвіжнікам Паўла» (Ц. Г., III, 4, 9), трэцім рымскім біскупам (Ц. Г., III, 4, 9; III, 21). Ён лічыць, што Клімент Рымскі стаў біскупам «на дванаццатым годзе царствання Даміцыяна» (Ц. Г., III, 15), г. зн. у 92 годзе, і дзевяць год «узначальваў навучанне Боскаму слову» (Ц. Г., III, 34). Ён жа дадае, што ў трэці год царствавання Траяна, г. зн. у 101 годзе, «Клімент, біскуп Рымскі, спачыў, перадаўшы сваё служэнне Эварэсту» (Ц. Г., III, 34). Акрамя таго, Яўсевій піша, спасылаючыся на паданне, што Клімент ці пераклаў з яўрэйскага на грэчаскі Пасланне да яўрэяў, якое прыпісваецца апосталу Паўлу, ці сам напісаў яго (Ц. Г. III, 38, 2; VI, 25, 14). Што датычыцца часу, які гэты біскуп займаў рымскую кафедру, то гісторыкі прыводзяць некалькі іншую даціроўку - 88 - 97 гг. [31], або 90 - 99 гг.[32].

Працягвае традыцыю Ірынея і Яўсевія Іеранім Стрыдонскі. Гэты аўтар, па-першае, таксама атаясамлівае Клімента Рымскага з Кліментам паплечнікам апостала Паўла; па-другое, называе яго чацвертым біскупам Рыма пасля Пятра і датуе яго смерць, як і Яўсевій, трэцім годам кіравання імператара Траяна (Аб знакамітых мужах, 15). У той жа час Іеранім прыводзіць іншыя звесткі, што Клімент быў другім пасля апосталаў біскупам, спасылаючыся пры гэтым на тое, што так лічаць «многія лацініяне» (Аб знакамітых мужах, 15).

Упершыню дадзеныя звесткі з'яўля.цца ў творы, напісаным паміж 193 і 203 гг. адным з заснавальнікаў хрысціянскага багаслоўя – Тэртуліянам. Гэта праца мае назву «Аб прэскрыпцыі супраць ерэтыкоў» - адразу бачна падабенства з назвай кнігі Ірынея «Супраць ерасяў». Прычым назіраецца падабенства не толькі знешняе. Тэртуліян, як і Ірыней, даказвае чысціню вучэння хрысціянскай царквы праз пераемства біскупаў ад апосталаў. Як прыклад ён прыводзіць «апостальскія цэрквы» (заснаваныя апосталамі), у тым ліку і царкву Рыма, якую, па легендзе, заснаваў апостал Пётр. Тэртуліян паведамляе, што Клімент быў пастаўлены біскупам самім апосталам Пятром (Аб прэскрыпцыі супраць ерэтыкоў, 32). Тады, атрымліваецца, што Клімент быў не трэцім, а першым біскупам пасля Пятра.

Як жа тады быць з Лінам і Анаклетам? Гэтую супярэчнасць спрабуе вырашыць Епіфаній Кіпрскі. Ён лічыць Клімента ўсё ж трэцім рымскім біскупам і так тлумачыць словы Тэртуліяна: Клімент сапраўды мог быць пастаўлены біскупам самім апосталам Пятром, але адмовіўся ад пасады, саступіўшы яе Ліну, і ўжо затым пасля смерці Кліта (Анаклета) «вымушаны быў зноў прыняць біскупства» (Панарыён, XXVII, 6). Некаторая нацягнутасць у гэтым тлумачэнні відавочна. Але галоўнае, Епіфаній такім чынам працягвае традыцыю Ірынея і Яўсевія, і адстойвае меркаванне, што Клімент быў трэцім біскупам. Таму варта пагадзіцца з гісторыкам раннехрысціянскай царквы П. Прэабражэнскім, які падкрэсліваў: «Калі б Клімент сапраўды займаў першае месца, як непасрэдны пераемнік Пятра, то было б нерастлумачана, якім чынам у шэраг яго папярэднікаў маглі трапіць гэтыя настолькі малавядомыя імёны Ліна і Анаклета; а між тым легка зразумець, як Клімент, усюль вядомы і паважаны вучань апостальскі, з цягам часу мог бы выціснуць у лацінскім паданні імёны тых біскупаў»[33].

Вось практычна ўсе, што мы ведаем аб Кліменце Рымскім. Аднак ёсць штосьці яшчэ, што выдзяляе яго з шэрагу першых рымскіх біскупаў, і гэта ні што іншае, як Першае пасланне да карынфянаў, якое прыпісваецца Кліменту Рымскаму. Яно пралівае святло на некоторыя аспекты становішча рымскай абшчыны ў канцы I ст. Таксама мы знаходзім у гэтай крыніцы некаторыя звесткі аб самім аўтары пасланія (Кліменце). Усе гэта дае гісторыкам права сцвярджаць, што «Пасланне св. Клімента выводзіць нас з вобласці мрака»[34], у які рымская абшчына на некаторы час пагрузілася ў сярэдзіне 60-х

гг. I ст. Варта заўважыць, што рымскія біскупы (прэсвітэры) пісалі, відавочна, рэдка і да сярэдзіны II ст., за выключэннем св. Клімента, не пакінулі пасля сябе ніякай іншай літаратурнай спадчыны.

На падставе даследваных першакрыніц і навуковых прац, мы прыходзім да высновы, што заснавальнікамі хрысціянскай абшчыны ў Рыме былі, насуперак царкоўнай традыцыі, не самі апосталы, а іх вучні (магчыма тыя, каго апостал Павел узгадвае ў Пасланіі да рымлянаў), або рымскія іўдзеі, ўвераваўшыя ў дзень Пяцідзесятніцы. Таму хрысціянства ў сталіцы імперыі магло з'явіцца даволі рана – у 2 палове 30 гг. Уцэлым, 60 – 90 гг. I ст. - выключна важны перыяд у гісторыі рымскай царквы. Менавіта ў гэты час пачынаецца яе ўзвышэнне, звязанае з тым, што рымская царква паступова займае месца іерусалімскай ў якасці хрысціянскага цэнтра Рымскай імперыі. Здаецца верагодным, што на чале рымскіх хрысціян у той час стаяў не біскуп, а калегія прэсвітэраў. Імены некаторых з іх (Лін, Анаклет і Клімент) і данеслі да нас крыніцы.

Разам з тым у гісторыі хрысціянства ў Рыме па-ранейшаму застаецца шмат і «белых» і «чорных» плям. З прычыны недахопу крыніц гэты перыяд застаецца недастаткова вывучаным у сусветнай гістарыяграфіі рымскай царквы. Больш таго, як у рускамоўнай навуковай традыцыі, так і ў беларускамоўнай, спецыяльныя даследванні па гэтай праблеме адсутнічаюць. Гэтая акалічнасць робіць вывучэнне кола пытанняў, разгледжаных ў артыкуле, асабліва актуальным.

---

[1] Кассиан (Безобразов). Христос и первое христианское поколение. Париж-Москва, 1996. С. 187; Левинская И. Деяния Апостолов на фоне еврейской диаспоры. СПб., 2000. С. 299; Свенцицкая И. Раннее христианство: страницы истории. М, 1989. С. 61, 163; Тронский И. Chrestiani и Chrestus// Античность и современность. М., 1972. С. 40; Фаррар Ф. Жизнь и труды апостола Павла. СПб., 1887. С. 544; McGiffert A. C. A history of Christianity in the apostolic age. NY, 1929. p. 362.

[2] Донини А. У истоков христианства. М., 1989. С. 177; Дюшен Л. История древней церкви: в 2 т. Т. 1. М., 1912. С. 36; Иванов А. Руководство к изучению священных книг Нового Завета. Обозрение апостольских посланий и Апокалипсиса. СПб., 1915. С. 143; Кассиан (Безобразов). Христос и первое христианское поколение. С. 186; Поснов М. История христианской церкви (до разделения церквей – 1054). Киев, 1991. С. 54; Barnard L. W. Studies in church history and patristics. Thessaloniki, 1978. p. 132; Duffy E. Saints and Sinners. London, 2002. p. 9; Robertson J. Redating the New Testament. London, SCM Press. 1976. p. 113; Walker W. A History of the Christian Church. Ed., 1947. p. 26; Watson F. Paul, Judaism and the Gentiles. A Sociological Approach. Cambridge, 1989. p. 91.

[3] Дюшен Л. История древней церкви. Т.1. С.37, 40; Ренан Э. Антихрист. М., 1991. С. 414; Фаррар Ф. Жизнь и труды апостола Павла. С. 546.

[4] Дюшен Л. История древней церкви. Т. 1. С. 146.

[5] Мансуров С. Очерки из истории церкви // Богословские труды, VII, 1987. С.6; Терновский С., Терновский Ф. Три первые века христианства. Киев, 1878. С. 85; Функ Ф. История христианской церкви. М., 1894. С. 55; Поснов М. История христианской церкви (до разделения церквей – 1054). С. 94 - 95.

[6] Ренан Э. Рим и христианство // Раннее христианство: в 2 т. Т. 2. М., 2001. С. 52.
[7] Ренан Э. Рим и христианство // Раннее христианство. Т. 2. С. 52.
[8] Ренан Э. Евангелия и второе поколение христианства. М., 1991. С.42 - 54; Христианство: Энциклопедический словарь.: в 3 т. Т. 2. М., 1995. С.187; Христианство: Энциклопедический словарь: в 3 т. Т. 3. М., 1995. С. 250.
[9] Ренан Э. Христианская церковь. М., 1991. С.173 -188; Ренан Э. Марк Аврелий и конец античного мира. М., 1991. С. 45 - 61; Христианство: Энциклопедический словарь: в 3 т. Т. 1. М., 1995. С. 769 - 772.
[10] Ренан Э. Христианская церковь. С.180 - 182.
[11] Ренан Э. Рим и христианство // Ранее христианство. Т. 2. С.53 - 54.
[12] Там жа. С. 54.
[13] Робертсон. Дж. История христианской церкви со времен апостольских до реформации. М., 1878. С.4; Walker W. A History of the Christian Church. p. 33.
[14] Функ Ф. История христианской церкви. С. 55.
[15] Дюшен Л. История древней церкви. Т. 1. С. 43.
[16] Игнатий Богоносец. Послание к Римлянам // Писания мужей апостольских. Киев, 2001. С. 290.
[17] Тацит. Анналы, XV, 44; Светоний. Жизнь 12 цезарей, Нерон, XVII.
[18] Ренан Э. Евангелия и второе поколение христианства. С. 252.
[19] Гергей Е. История папства. М., 1996. С. 20; Дюшен Л. История древней церкви. Т. 1. С. 58, 158; Ковальский Я. Папы и папство. М., 1991. С.6; Свенцицкая И.С. Раннее христианство: страницы истории. С. 151; Walker W. A history of Christian Church. p. 47; William J. La Due. Na tronie sw. Piotra. Historia papiestwa. Wroclaw, 2004. s. 31, 34.
[20] Ренан Э. Евангелия и второе поколение христианства. С. 94.
[21] Лебедев А. По вопросу о происхождении первохристианской иерархии // Богословский вестник. 1907, №3. С.460 - 474.
[22] Ренан Э. Евангелия и второе поколение христианства. С. 94, прим. 5.
[23] Рожков В. Очерки по истории римско-католической церкви: в 2 ч. Ч. 1. М., 1994. С. 14.
[24] Гергей Е. История папства. С. 455; Задворный В. История римских пап: в 2 т. М., 1995. Т. 1. С.15; Поснов М. История христианской церкви (до разделения церквей – 1054). С. 128; Рожков В. Очерки по истории римско-католической церкви. Ч. 1. С. 14; Maxwell-Stuart P. G. Chronicle of the popes. – London, 2006. p. 17.
[25] Задворный В. История римских пап. Т. 1. С.15.
[26] Гергей Е. История папства. С. 455; Задворный В. История римских пап. Т. 1. С. 16.
[27] Поснов М. История христианской церкви (до разделения церквей – 1054). С. 128; Maxwell-Stuart P. G. Chronicle of the popes. London, 2006. p. 17.
[28] Задворный В. История римских пап. Т. 1. С. 16.
[29] Ренан Э. Евангелия и второе поколение христианства. С. 94.
[30] Ренан Э. Рим и христианство // Раннее христианство. Т. 2. С. 57.
[31] Задворный В. История римских пап. Т. 1. С. 17.
[32] Поснов М. История христианской церкви (до разделения церквей – 1054). С. 128; Гергей Е. История папства. С. 455
[33] Преображенский П. О святом Клименте Римском и его Первом Послании к Коринфянам // Писания мужей апостольских. Киев, 2001. С. 69.
[34] Дюшен Л. История древней церкви. Т. 1. С. 386.